ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

№ 8 (8356), чацвер, 23 студзеня 2020 года

**Адукацыя ў асобах**

***Ірына Цеаміраўна Лазаковіч — педагог працавіты, добрасумленны, адказны. Яна не толькі крочыць у нагу з часам, але і імкнецца яго апярэджваць, прымяняць новыя эфектыўныя методыкі. Ірына Цеаміраўна кожны год запальвае зорачкі таленту гімназістаў, вучыць, падтрымлівае іх і дапамагае дасягаць высокіх вынікаў у вывучэнні французскай мовы.***

# Запальваць зорачкі таленту



Ірына Цеаміраўна — педагог у трэцім пакаленні. У свой час настаўнікамі працавалі яе бабуля і бацька. У доме было шмат кніг, часопісаў. Школа для яе — гэта і першыя дасягненні, і першыя цяжкасці, і верныя сябры. Беражліва гартаючы школьны альбом, Ірына Цеаміраўна прыгадвае, што ў школе вучыцца ёй падабалася. Пашанцавала і з настаўнікамі. На выбар будучай прафесіі станоўчы ўплыў аказала настаўніца французскай мовы школы № 3 Віцебска Ларыса Іванаўна Ізафатава.

У 1979 годзе Ірына Цеаміраўна скончыла Мінскі інстытут замежных моў па спецыяльнасці "Французская і нямецкая мова". Для маладога спецыяліста першым рабочым месцам стала школа ў пасёлку Акцябрскі Віцебскай вобласці. У 1995 годзе Ірыну Цеаміраўну як перспектыўнага педагога запрасілі на работу ў гімназію № 3 Віцебска. Зараз яе педагагічны стаж складае больш за 40 гадоў. Ірына Цеаміраўна, педагог вышэйшай катэгорыі, валодае сучаснымі падыходамі ў навучанні і выхаванні. Рыхтуючыся да ўрокаў, падбірае дыферэнцыраваныя заданні з улікам узроўню падрыхтоўкі навучэнцаў.

І.Ц.Лазаковіч арганізоўвае адукацыйны працэс цікава, пазнавальна. Яе прафесійная кампетэнтнасць і добрасумленнасць, эрудыцыя і працавітасць, імкненне да ўдасканалення педагагічнага майстэрства дазваляюць дасягаць высокіх вынікаў на ўроках і ў пазакласнай дзейнасці. У 2018/2019 навучальным годзе вучні Ірыны Цеаміраўны былі пераможцамі абласнога этапу Рэспубліканскай алімпіяды па французскай мове і атрымалі 4 дыпломы, а таксама фестывалю міжкультурных камунікацый, Рэспубліканскага фестывалю франкафонных тэатраў. Неаднаразова навучэнцы настаўніцы станавіліся пераможцамі заключнага этапу алімпіяды. Так, у 2018/2019 навучальным годзе вучаніца 10 класа Настасся Косарава на заключным этапе Рэспубліканскай алімпіяды па французскай мове была ўзнагароджана дыпломам II ступені. Сёлета на раённым этапе рэспубліканскай алімпіяды гімназісты атрымалі 9 дыпломаў.

Вялікую ўвагу настаўніца ўдзяляе заняткам з навучэнцамі ў навукова-даследчым кірунку. Даследчая работа вучаніцы 9 класа Ульяны Мацвеевай на Абласной навукова-практычнай канферэнцыі "Эўрыка" была адзначана дыпломам III ступені.

Ірына Цеаміраўна праводзіць вялікую работу сярод настаўнікаў французскай мовы Віцебскай вобласці па ўдасканаленні методыкі выкладання мовы, выступаючы перад калегамі на семінарах, пасяджэннях метадычных фарміраванняў. На працягу васьмі гадоў яна з'яўлялася кіраўніком метадычнага аб'яднання настаўнікаў замежнай мовы. Майстар-класы, семінары, якія яна праводзіць для настаўнікаў французскай мовы, спрыяюць творчаму росту педагогаў, авалоданню імі тэорыяй і практыкай сучасных тэхналогій. Таксама Ірына Цеаміраўна чытае лекцыі па методыцы выкладання французскай мовы для слухачоў Віцебскага абласнога інстытута развіцця адукацыі.

Міжнароднае супрацоўніцтва нашай гімназіі з Францыяй пачалося ў 2007 годзе з наведвання настаўнікамі французскай мовы горада Невера, пасля чаго шчырыя зносіны прадоўжыліся. Добрай традыцыяй сталі штогадовыя сустрэчы педагогаў Беларусі і Францыі. Пры гэтым гімназія пастаянна пашырае сферу міжнароднага супрацоўніцтва, прымае ўдзел у новых культурна-адукацыйных праграмах і праектах, што дазваляе навучэнцам развіваць сацыякультурную і камунікатыўную кампетэнцыі, авалодваць асновамі міжнацыянальных зносін. З 2009 года ў гімназіі рэалізоўваецца міжнародны праект "Дыялог культур. Францыя — Беларусь". Традыцыйным стала правядзенне міжнароднага вэб-моста паміж педагогамі нашай гімназіі і французскімі калегамі.

Ірына Цеаміраўна Лазаковіч прымае актыўны ўдзел у міжнародным абмене педагагічным вопытам. У гэтым навучальным годзе адбылася радасная падзея: візіт французскіх партнёраў асацыяцыі "Францыя — Расія — краіны СНД" Мішэль Пія-Бонэ і валанцёраў асацыяцыі. Трэба адзначыць, што Мішэль Пія-Бонэ — заслужаны педагог са шматгадовым стажам, лаўрэат прэміі Міністэрства адукацыі Францыі ў галіне развіццёвага навучання. З навучэнцамі гімназіі былі праведзены сустрэчы, адкрытыя ўрокі, пазакласныя мерапрыемствы. Пад кіраўніцтвам Ірыны Цеаміраўны вучні 8—11 класаў падрыхтавалі і правялі экскурсіі на французскай мове ў Доме-музеі Марка Шагала і ў гімназічным музеі.

З 2019 года І.Ц.Лазаковіч узначальвае работу раённага рэсурснага цэнтра па французскай мове, які арганізаваны на базе гімназіі. У планах — павышэнне тэарэтычнага і практычнага ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў, пашырэнне сферы міжнароднага супрацоўніцтва, удзел у новых культурна-адукацыйных праграмах і праектах.

За высокія паказчыкі ў падрыхтоўцы навучэнцаў да ўдзелу ў алімпіядным руху і шматгадовую плённую працу Ірына Цеаміраўна была неаднаразова ўзнагароджана граматамі раённых, гарадскіх, абласных улад. У 2017 годзе педагогу была ўручана Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар гімназіі Людміла Васільеўна Сомава адзначае: "Ірына Цеаміраўна карыстаецца заслужанай павагай сярод настаўнікаў, навучэнцаў і іх бацькоў. Душэўнасць і прастата — адметныя рысы яе характару. Ірына Цеаміраўна валодае незгасальным імкненнем да новага. Урокі праводзіць на высокім прафесійным узроўні, выкарыстоўвае ў сваёй рабоце метады і прыёмы, якія садзейнічаюць развіццю творчых здольнасцей навучэнцаў, фарміруе глыбокія тэарэтычныя веды, цікавасць да вывучэння французскай мовы".

Ірына Цеаміраўна лічыць сябе шчаслівым чалавекам, таму што ў яе ёсць любімая сям'я, цікавая работа, перспектывы развіцця, імкненне рухацца наперад і дасягаць разам з навучэнцамі новых вышынь.

**Вольга БАГАСЛОЎСКАЯ,**
**настаўніца геаграфіі і біялогіі гімназіі № 3 Віцебска імя А.С.Пушкіна.**
**Фота з архіва гімназіі.**

Рэдакцыя "Настаўніцкай газеты" стварыла новы сродак масавай інфармацыі — сеткавае выданне, каб быць яшчэ бліжэй да вас, мець больш цесную зваротную сувязь, значна пашырыць інфармацыйную прастору адукацыйнай сферы і стаць сапраўднай пляцоўкай для абмену прафесійным вопытам. Спадзяёмся ўбачыць вас галоўнымі стваральнікамі рэсурсу.

NG-PRESS.BY

АДУКАЦЫЙНАЯ ПРАСТОРА БЕЛАРУСІ Ў АДЗІНЫМ СЕТКАВЫМ ВЫДАННІ